Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (133), 2022

*УДК 811.161.3’42’371:398.61*

# Функцыянальна-сэнсавыя тыпы дыскурсу беларускіх народных загадак

А.А. Станкевіч

Артыкул прысвечаны апісанню функцыянальна-сэнсавых тыпаў беларускіх народных загадак як камунікатыўна абумоўленых маўленчых жанраў. Пры гэтым структурна-семантычныя мадэлі загадак разглядаюцца паводле вербалізацыі ў іх дыскурсе трох кампанентаў: загаданага прадмета – дэнатата; аб’екта, які кадзіруе загаданы прадмет – субстытута і агульнага для іх вобраза. У артыкуле вызначаюцца дыскурснаўтваральныя вербалізатары розных тыпаў загадак, апісваюцца іх кагнітыўная і лінгвапрагматычная функцыі, ацэньваюцца выкарыстоўваемыя слоўнавобразныя сродкі і выяўленча-выразны патэнцыял.
**Ключавыя словы:** загадка, дыскурс, функцыянальна-сэнсавы тып, структурна-семантычная мадэль, дыскурсаўтваральныя вербалізатары, кагнітыўная і лінгвапрагматычная функцыі.

The article is devoted to the description of functional and semantic types of discourse of Belarusian folk riddles as communicatively conditioned speech genres. At the same time, the structural and semantic models of riddles are considered in connection with the verbalization of three components in their discourse: the object to be guessed – the denotation; the object encoding the object to be guessed – the substitute and the image common to them. The article defines the discourse-forming verbalizers of various types of riddles, describes their cognitive and linguistic-pragmatic functions, evaluates the means of verbal imagery used and the visual-expressive potential.
**Keywords:** riddle, discourse, functional and semantic type, structural and semantic model, discourse-forming verbalizers, cognitive and linguistic-pragmatic functions.

Любы тэкст, як вядома, можна разглядаць як адлюстраванне пэўнага тыпу маўленчага жанру. Мова, паводле М. Бахціна, рэалізуецца ў працэсе маўленчага акта ў выказваннях, форму якіх і складаюць маўленчыя жанры. Камунікатыўная тактыка і стратэгія маўленчых паводзін у самых розных маўленчых сітуацыях рэалізуецца з улікам вялікай колькасці розных маўленчых жанраў, якія маюць пэўныя функцыянальна-сэнсавыя адметнасці [1, с. 237].

Адным з відаў вуснай народна-паэтычнай творчасці з’яўляюцца загадкі, якія традыцыйна адносяць да малых фальклорных жанраў. Народныя загадкі ў сістэме іншых жанраў вуснай народна-паэтычнай творчасці вызначаюцца невялікім тэкставым аб’ёмам, лаканічным выкладам думкі, афарыстычнасцю выражэння, выяўленчай выразнасцю і вобразнасцю.

Загадкай называюць «іншасказальнае вобразнае апісанне якога-небудзь прадмета або з’явы на аснове падабенства паміж утоеным прадметам, які трэба адгадаць, і тым, які замяняе яго ў загадцы» [2, с. 10].

Аб’ектам аналізу ў артыкуле з’яўляюцца беларускія народныя загадкі, змешчаныя ў зборніку «Загадкі» (серыя «Беларуская народная творчасць») [3], мэтай – вызначэнне функцыянальна-сэнсавых тыпаў дыскурсу народных загадак.

Пад функцыянальна-сэнсавымі тыпамі маўлення традыцыйна маюцца на ўвазе камунікатыўна абумоўленыя тыпы маўлення, выкарыстоўваемыя ў адпаведнасці з яго прызначэннем і сэнсам – апавяданне ў тэксце пра развіццё і змены падзей, апісанне характэрных прыкмет і ўласцівасцей прадметаў і з’яў, разважанне аб іх пэўных асаблівасцях [4].

Шматграннасць формы, разнастайнасць зместу і спосабаў «шыфроўкі» загаданага прадмета, кагнітыўная значнасць і прагматычная накіраванасць народных загадак дазваляе, на наш погляд, прымяніць паняцце *функцыянальна-сэнсавыя маўленчыя тыпы* да дыскурсу народных загадак.

Даследчыкі вуснай народна-паэтычнай творчасці выдзяляюць наступныя тыпы загадак: загадкі-апісанні, загадкі-метафары, загадкі-пытанні, загадкі-дыялог, загадкі-задачы [2].

Паводле меркавання лінгвістаў, семантычную структуру народнай загадкі складае ўзаемасувязь трох кампанентэў: загаданага аб’екта, або дэнатата, аб’екта, які замяшчае, кадзіруе загаданы аб’ект – субстытута і агульнага для іх вобраза [5, с. 198].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У складзе народных загадак даволі часта сустракаецца функцыянальна-сэнсавы тып загадкі-апісанне, які мае дэскрыптыўную форму вербалізацыі зместу. Дэскрыптыўная форма падачы зашыфраванага прадмета ў такіх загадках грунтуецца на апісанні дэнатата, які неабходна адгадаць. Пры гэтым адзначаюцца рэлевантныя, адрозныя адзнакі прадмета. Моўная рэпрэзентацыя загаданага прадмета ў загадках-апісаннях уключае ўказанне на колер, форму, памер, прасторавую характарыстыку, стан, дзеянне і ўспрыняцце чалавекам дэнатата, які неабходна адгадаць. У іх не называецца субстытут, што замяшчае дэнатат, а апісваюцца яго прыкметы і якасці, якія выконваюць ролю падказкі для разгадкі. Структурна-семантычная мадэль такіх загадак уключае атрыбутыўную, кваліфікатыўную і прэдыкатыўную характарыстыку дэнатата. Атрыбутыўная характарыстыка можа быць статычнай – адзначае форму загаданага прадмета: «*Круглае, доўгае, ніхто не дастане*. Неба» [№ 1]; яго колер: «*Не чарнёны, а ўвесь чорны*. Воран» [3, № 1345]; смакавыя якасці: «*Чырвоны колер, вінны смак*. Вішня» [3, № 809]; прасторавыя ўласцівасці: «*Відзен край, а дабрацца да яго нельга*. Гарызонт» [3, № 93] і інш.

У такіх загадках, як правіла, выкарыстоўваюцца азначэнні, якія адлюстроўваюць эйдычную, канкрэтна-пачуццёвую форму ўспрыняцця аб'ектыўнай рэчаіснасці і ўказваюць на знешнюю характарыстыку загадваемых прадметаў.

У некаторых загадках апісанне дэнатата можа быць дынамічным – адлюстроўвае змены, якія адбываюцца з ім: «*Летам зялёны, а восенню чырвоны*. Яблык» [3, № 799]; «*Летам жоўценькі, а зімою беленькі*. Заяц» [3, № 1319], пры гэтым могуць дэтэрмінавацца фактары, якія абумовілі змены загаданага прадмета: «*Было жоўтым, вырасла зялёным, сонца пацалавала, зноў жоўтым стала*. Пшаніца» [3, № 546]; «*Вісіць – зялёны, ляціць – жоўты, ляжыць – чорны*. Ліст» [3, № 421]; «*Жывы – чорны, памрэ – чырвоны*. Рак» [3, № 1389].

Кваліфікатыўная характарыстыка дэнатата з'яўляецца дадатковай. Напрыклад, яна адзначае яго карысныя для чалавека ўласцівасці: «*Шараваты, кудраваты, а навярху плеш, на здароўе з'еш*. Качан капусты» [3, № 651]; «*Круцестая, вярцестая, хто яе дбае, будзе сто год жыць*. Капуста» [3, № 652]; «*Кругленька, бяленька, усяму свету міленька*. Сонца» [3, № 5]; «*Маленькае, бяленькае ўвесь свет адзене*. Іголка» [3, № 1848].

Прэдыкатыўная характарыстыка дэнатата звычайна падкрэслівае асаблівасці яго дзеяння, змены стану: «*Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць*. Гром» [3, № 166]; «*Дыхае, расце, а хадзіць не можа*. Расліна» [3, № 396]; «*Увосень рассыпаецца, улетку збіраецца, само поўнае бывае, людзей накармляе*. Жыта» [3, № 540]; «*Расла, павырасла, з куста вылезла, па руках пакацілася, на губах ачуцілася*. Гарох» [3, № 591]; «*Крыллямі маша, а ляцець не можа*. Вятрак» [3, № 1924]: «*Хутка грызе, дробна жуе, сама не глытае*. Піла» [3, № 2675]; «*Фыркае, рыкае, галіны ламае, пыл падымае, цябе з ног збівае, чуеш яго, ды не бачыш*. Вецер» [3, № 189].

Нярэдка ў загадках-апісаннях атрыбутыўная характарыстыка дэнатата спалучаецца з прэдыкатыўнай, што стварае living разнабаковае, комплекснае апісанне загаданага прадмета: «*Калматы, вусаты, есці пачынае, песенькі спявае*. Кот» [3, № 1123]; «*Малое, доўгае ўвесь свет пройдзе*. Вуж» [3, № 1420]; «*Ляжыць пад ганкам, хвост абаранкам*. Сабака» [3, № 1112]; «*Тонкі, доўгі, а ўпадзе – з травы не відаць*. Дождж» [3, № 207]; «*Скручана, змучана па хаце скача*. Венік» [3, № 2547]; «*Маленькі, гарбаты сцеражэ хаты*. Замок» [3, № 2291]; «*Кругленькае, касмаценькае да неба дакіне*. Вока» [3, № 948].

Надзвычай распаўсюджаныя ў складзе народных загадак загадкі-метафары. Аснову функцыянальна-сэнсавага тыпу загадкі-метафары складае іншасказальны, алегарычны вобраз, які ў сімвалічнай форме «кадзіруе» загаданы аб'ект. Пры гэтым выкарыстоўваюцца антрапаморфны: «*Два браты ў ваду глядзяцца, а ніколі не сойдуцца*. Берагі» [3, № 132]; зааморфны: «*Сівы жарабец на ўсё царства заржаў*. Гром» [3, № 160]; арнітаморфны: «*Ходзіць курка-жаўтушка па сене і не шастае*. Сонца» [3, № 29]; фітаморфны: «*Са страхі морква вісіць, да зямлі не дастане, паху не мае, зімой вырастае*. Ледзяшы» [3, № 298] і рэчыўны коды: «*Глянь праз акно, відаць сіняе палатно*. Неба» [3, № 298].

Субстытутам, які ў загадках-метафарах замяшчае загаданы прадмет можа быць вобраз чалавека: «*У лазе стаіць казак на адной назе*. Грыб» [3, № 498]; жывёлы: «*Бег кот, павесіў хвост на плот*. З гарбуза лісце» [3, № 736]; птушкі: «*Поўна хата вераб'ёў*. Агурок» [3,

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

№ 700]; расліны: «*Уся дарожка ўсыпана гарошкам.* Зоркі» [3, № 83]; прадметы побыту: «*Ні дзірачкі, ні дзянца поўна бочачка вінца.* Яйцо» [3, № 1212]. Вобраз загаданага прадмета ствараецца на аснове розных відаў асацыяцыйных сувязей паміж дэнататам і субстытутам. Асацыятамі могуць выступаць знешні выгляд, форма, паводіны, колькасная або прасторавая характарыстыка дэнатата. Асацыяцыйны механізм утварэння іншасказальнага вобраза, які «кадзіруе» дэнатат, надае дыскурсу загадкі вобразнасць, выразнасць і займальнасць.

Маўленчае выказванне, як вядома, можа мець рознае інтанацыйнае афармленне – апавядальнае, пытальнае і клічнае. Дыскурс народнай загадкі ў выключнай большасці з'яўляецца апавядальным. Гэта абумоўлена тым, што асноўная функцыя загадкі – кагнітыўная, яна мае выразную прагматычную накіраванасць на адрасата: садзейнічае развіццю яго пазнавальнай дзейнасці і навыкаў мысленчай здольнасці, кемлівасці, дасціпнасці, умення лагічна разважаць.

Неабходна адзначыць, аднак, што ў сістэме загадак як асобны функцыянальна-сэнсавы тып выдзяляюцца загадкі-пытанні, якія матывуюць адрасата на дзеянне ў адказ, актывізуюць яго ўвагу, ствараюць займальнасць і экспрэсіўнасць выкладу. Як паказваюць прыклады, часцей за ўсё загадкі-пытанні маюць прадметную накіраванасць. Структурна-семантычная мадэль такіх загадак абавязкова ўключае займеннікі *хто што*, якія акрэсліваюць пытальную форму і прагматычны характар выказвання: «*Што гарыць без агню*? Зара» [3, № 3248]; «*Хто малюе без рук і алоўка*? Мароз» [3, № 3263]. Дэнататамі такіх загадак могуць быць рэаліі жывёльнага: «*Хто з барадой родзіцца*? Казёл» [3, № 3290] і расліннага свету: «*Што расце без цвету*? Папараць» [3, № 3254]; прыродныя з'явы: «*Хто ляціць без крылляў*? Вецер» [3, № 3259]; рэчывы: «*Што бяжыць без повада*? Вада» [3, № 3251]; уласцівасці чалавека: «*Хто без чаго не абойдзецца*? Чалавек без імені» [3, № 3287]; яго стан: «*Без чаго чалавек жыць не можа*? Без сну» [3, № 3272]; прадметы побыту: «*Што ў першы дзень года пачынаецца, а ў апошні канчаецца*? Каляндар» [3, № 3473]; прылады працы: «*Што ходзіць дагары нагамі*? Верацяно» [3, № 1799]; музычныя інструменты: «*Што без слёз плача?* Скрыпка» [3, № 3279]; адцягненыя з'явы: «*Што на сабе не ўчуеш?* Рост» [3, № 3274] і інш.

Дыскурсаўтваральнымі вербалізатарамі ў некаторых загадках-пытаннях з'яўляюцца перлакутывы – маўленчыя формулы ўздзеяння на рэцыпіента тыпу *загадаю, адгадай, скажы,* якія адлюстроўваюць інтэнцыю, маўленчы намер гаворачага, што таксама падкрэслівае лінгвапрагматычны патэнцыял народных загадак: «*Зімой расце коранем уверх, а вясной памірае. Хто адгадае*? Лядзяш» [3, № 297]; «*Кругом вада, а з піццём бяда. Хто адгадае, дзе гэта бывае*? На моры» [3, № 141]; «*Загадаю зáгадку: улажу ў яму ягадку, выну, абліжу ды ізноў палажу*. Лыжка і міска з кашай» [3, № 2059]; «*Што гэта такое, скажы мне шчэра, што з чалавека зрабіць можа звера*? Гарэлка» [3, № 2040].

Выкарыстанне ў народных загадках форм, якія акрэсліваюць маўленчы намер гаворачага, ставарае ілакуцыйную мадальнасць дыскурсу, што ўзмацняе яго выяўленчую выразнасць.

Акрамя загадак-пытанняў з прадметнай накіраванасцю, сустракаюцца жартаўлівыя загадкі-пытанні з ускоснай формай выражэння зместу, разлічаныя на кемлівасць і здагадлівасць адрасата: «*На што каню хамут кладуць*? На шыю» [3, № 3307]; «*Ад чаго ў вуткі ногі чырвоныя*? Ад кален» [3, № 3332]; «*Што бывае пасля сямі гадоў*? Восьмы» [3, № 3327]; «*Чаму шапку купляюць?* Бо дарам не даюць» [3, № ; 3329]; «*Што пасярэдзіне Кіева стаіць*? Літара "Е"» [3, № 3335]; «*З якіх варот Пётр I выязджаў на вайну*? З адкрытых» [3, № 3346].

Адметным у структурна-сэмантычным плянэ з'яўляецца функцыянальна-сэнсавы тып загадак-дыялёгаў, якія звычайна ў алегарычнай форме перадаюць жартаўлівую размову, што наводзіць адрасата на адгадку зашыфраванага прадмета. У такіх загадках у дыялёг удзельнічае некалькі «пэрсанажаў» – мэтафарычных эквівалентаў загаданых прадметаў: « *–Куды ідзеш, крывая крывуліца? А чаго стаіш, стрыжана патыліца*? Рэчка і сенажаць» [3, № 125]; « *–Крывое, малое, куды бяжыш? – А што табе за дзела, стрыжаны чорт*. Ручай і луг» [3, № 129]; « *–Што ты стаіш, крывы, кульгавы? –Зялёныя, кудравыя сьцеражу*! Плот і жыта» [3, № 2631]; «*Душа кажа: "Згуба мая". Цела кажа: "Радасьць мая"*. Гарэлка» [3, № 2039]; «*Рыжа ў краснае спрасіла: "Чым ты бораду красіла?" – "Ані краскай, ані змазкай: перад солнышкам стаяла, угору бараду дзяржала"*. Рабіна» [3, № 417].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дыялогу ў загадках можа папярэднічаць апісальная частка –«словы аўтара», якія персаналізуюць персанажаў размовы: «*Адзін кажа: “Світай, божа”. Другі кажа: “Не дай, божа”. Трэці кажа: “А мне ўсё роўна: як удзень, так і ўночы, стаю, вытрашчыўчы вочы”.* Пасцель, дзверы, акно» [3, № 2408]; «*Ідзе крывая крывуліца. Стаіць стрыжаны бес. –Куды ты ідзеш, крывая крывуліца? –Якое табе дзела, стрыжаны бес. Куды ні пайду, дарогу знайду*. Рэчка і луг» [3, № 127]; «*Ляцелі тры галкі, селі на праталкі. Адна кажа – паляжым, другая – пабяжым, трэцяя – паківаемся*. Камень, вада, трава» [3, № 102].

У складзе народных загадак, асноўная маса якіх мае лаканічны тэкставы аб’ём, сустракаюцца разгорнутыя выказванні, якія сваім эпічным складам набліжаюцца да казкі. Іх можна аднесці да невялікага апавядання. Функцыянальна-сэнсавы тып загадкі-апавядання ўключае падрабязнае апісанне зашыфраванага прадмета: «*У горадзе на Сіяне стаіць дуб-вертадуб, на тым дубе пціца-верацяніца, ніхто яе не дастане: ні цар, ні царыца, ні красная дзявіца, ні добры маладзец*. Сонца» [3, № 16]; «*Жыў-быў капітан, сем душ пракармляў. Прыйшлося яму ўміраць, ніхто не бярэцца хаваць. Выкінулі за вугал і сабакі не ядзяць*. Гашчок» [3, № 2489]. У такіх загадках могуць выкарыстоўвацца ўстойлівыя фальклорныя формулы – казачны зачын: «*У горадзе на Сіяне*», «*За лясамі, за гарамі, за вялікімі марамі*»; «*Жыў-быў*», народна-паэтычныя эпітэты: *красная дзявіца, добры маладзец*, формы з прыдаткам: *дуб-вертадуб, пціца-верацяніца.*

Аповед у загадках такога тыпу з’яўляецца, як правіла, дынамічным. У загадках-апавяданнях часта іншасказальна распавядаецца пра «жыццё» загаданага персанажа, паказваюцца этапы яго існавання, змены, якія з ім адбываюцца: «*З зямлі радзіўся, на агні хрысціўся, на базар вазілі, па шчаках калацілі, на каня пасадзілі, у самы дым правадзілі*. Гаршчок» [3, № 2469]; «*Ляжыць у гары, божага свету не бачыць; прыйшлі адамавы дзеці, пачалі вярцеці, на курган круціць, на печах патапіць, жазлом за яго брацца, усякі можа ад яго пітацца*. Гаршчок» [3, № 2470].

Апавяданне ў такіх загадках можа весціся ад імя першай асобы, што персаналізуе выказванне, стварае суб’ектыўны, эмацыянальна-ацэначны характар выкладу зместу, надае размоўную афарбоўку дыскурсу загадкі. Вось як, напрыклад, іншасказальна паслядоўна распавядаецца працэс вырабу і выкарыстання пэўнага прадмета або прыстасавання: «*Быў я на капаньцах і на кляпаньцах, быў і на пажары, быў і на базары. Як молад быў – людзей карміў, як стар стаў – спавівацца стаў, як памёр – косці выкінулі і сабакі не ядуць*. Гаршчок» [3, № 2466]; «*Радзіўся я ў цяні, не відзеў ні сонца, ні месяца, дабраліся да мяне людзі, прабілі мне наскрозь грудзі, жалезным абручам мяне падпаясалі і скакаць казалі*. Жорны» [3, № 1904]; «*Мяне з дрэва наламалі, потым лыкам абвязалі, ну а я і не сумую ды па хаце ўсё танцую.* Венік» [3, № 2563]; «*Сам я тонак, як паясок, у мяне востранькі насок, як выйду на поле ваяваці проціў высокенькіх панічоў у злаце, яны мяне паясаюць, а мае востранькія зубкі іх усіх перакусаюць.* Серп» [3, № 1686].

Структурна-семантычная мадэль загадкі-апавядання можа будавацца па прынцыпу ланцужковага нанізвання пэўных іншасказальных элементаў выказвання. У такіх загадках назіраюцца кагерэнтныя, паслядоўныя суадносіны паміж структурнымі часткамі: «*Збудаваў бог дом круглы – без вуглоў, а ў тым доме дванаццаць вакон, а ў тых вокнах па чатыры паны, у тых паноў па сем сыноў, а кожнаму сыну па імені дано*. Год» [3, № 342]; «*Стаіць дуб, на дубе канапліна, на канапліне гліна, на гліне гарох, а ў гаросе свінні.* Дубовы стол, міса з гарохам і скваркамі» [3, № 2385]; «*Стаяць вілы, на вілах вісіць торба, на торбе кузьня, на кузні зіпала, на зіпале мігала, на мігале ельнік, а ў ельніку свінні ходзяць.* Чалавек» [3, № 834].

Апавядальны характар такіх загадак стварае надзвычай выразны калейдаскапічны малюнак загаданай з’явы, узмацняе займальнасць, вобразнасць і экспрэсіўнасць іх дыскурсу.

Адметнае месца ў складзе народных загадак займаюць загадкі-задачы. У гэтых загадках адрасату прапануецца рашыць пэўную задачу: «*Сем семярэй, семера свіней, свінка, свінчын брат і семера парасят*? Усяго 65» [3, № 3361]; «*Раздзяліць дваццаць рублёў, каб выйшла дзевяць бумажак*. 1 – 10 руб., 7 – па 1 руб. і 1 – 3 руб» [3, № 3360]; «*Падзяліць сорак каней у дзевяць стайняў, каб не было пароўну*. У 4 стайнях па 5 каней, а ў 5 стайнях па 4 кані» [3, № 3362].

Аднак не ўсе загадкі-задачы маюць матэматычны сэнс. Многія з іх носяць завуаляваны характар: «*Несла гаспадыня ў кошыку дзесяць яец, а дно ўпала. Колькі засталося*? Нічога, усе разбіліся» [3, № 3365]; «*Ляцела сарока, за ёю сорак. Колькі ляцела*? Двое» [3, № 3347]; «*Як*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*паставіць чатыры салдаты ў адным боце*? Зняць у кожнага па аднаму боту» [3, № 3370]; «*Ішоў брат з сястрою і муж з жаною, найшлі тры сыры. Як яны падзялілі*? Па аднаму сыру» [3, № 3357]; «*Стаяла ізба, а ў ізбе было сем акошак, а на кожным акошку сядзела сем кошак, а ў кожнай кошкі было па сем кацянят. У хаце было сем вокан, на кожным акне сядзела па сем кошак. У кожнай кошкі было па сем кацянят. Колькі ў іх ва ўсіх было ног? Увайшоў і я ў ізбу і маіх было дзве нагі.* Дзве нагі, а ў катоў – гэта ж лапы» [3, № 3350]. Такія загадкі-задачы не маюць рашэння, іх энігматычны змест разлічаны на здагадлівасць, кемлівасць і назіральнасць асобы, якая павінна разгадаць загадку. Як гумарыстычна адзначыў адзін з сучасных даследчыкаў жанра загадкі, «загадка загадкавая не толькі для таго, каму яна адрасавана, але яшчэ ў большай ступені для таго, хто хоча зразумець, што яна такое» [6].

Як паказваюць прыклады, загадкі-задачы патрабуюць ад асобы канцэнтрацыі ўвагі і хуткасці ўспрымання зместу, асэнсавання колькаснай сувязі паміж прадметамі, абазначанымі ў загадцы. Яны разлічаныя не толькі на праверку матэматычных здольнасцей чалавека, але і яго лагічнага мыслення. І ў гэтым таксама праяўляецца кагнітыўна-прагматычная функцыя загадак.

Такім чынам, функцыянальна-сэнсавыя тыпы дыскурсу беларускіх народных загадак вызначаюцца разнастайнасцю структурна-семантычнага мадэлявання, якое абумоўлівае адметныя дыскурснаўтваральныя вербалізатары зместу. Народныя загадкі маюць выразныя кагнітыўную і лінгвапрагматычную функцыи, яны садзейнічаюць развіццю пазнавальнай дзейнасці і навыкаў мысленчай здольнасці чалавека, фарміруюць кемлівасць, дасціпнасць, уменне лагічна разважаць.

Багацце і разнастайнасць слоўнавобразных сродкаў, выкарыстоўваемых у беларускіх народных загадках, стварае іх займальнасць і павышае выяўленча-выразны патэнцыял.

**Літаратура**

1. Бахтин, М. М. Проблема речевых жанров / М. М. Бахтин // Эстетика словесного творчества. – М., 1979. – 421 с.
2. Гурскі, А. І. Беларускія народныя загадкі / А. І. Гурскі // Загадкі ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : «Навука і тэхніка», 1972. – С. 5–20.
3. Загадкі / А. С. Фядосік (рэд.). – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 448 с.
4. Нечаева, О. А. Функционально-смысловые типы речи (описание, повествование, рассуждение) / О. А. Нечаева. – Улан-Удэ : Бурятское книжное изд., 1974. – 257 с.
5. Титова, Н. Г. История и изучение народных загадок в отечественном и зарубежном языкознании / Н. Г. Титова // Современная филология : материалы междунар. науч. конф., Уфа, апрель 2011 г. – Уфа : Лето, 2011. – С. 197–203.
6. Сендерович, С. Я. Морфология загадки [Электронный ресурс] / С. Я. Сендерович. – М. : Языки славянской к-ры, 2008. – Режим доступа : https://avidreaders.ru/book/morfologiya-zagadki. – Дата доступа : 12.12.2021.

Гомельский государственный
университет имени Франциска Скорины

Поступила в редакцию 28.12.2021

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ